# Не спыняе справу Зюзя-Дзед Мароз

Па лясных сцяжынках казкі прабягаюць
І студзёным часам свята набліжаюць.
Дрэўцы абсыпае хараством з нябёс,
Не спыняе справу Зюзя-Дзед Мароз!

Па ўсяму па свету шчодра пралятае,
Дзесьці апаўночы ў госці завітае.
Падарункаў хопіць, вось іх цэлы воз –
Не спыняе справу Зюзя-Дзед Мароз!

Нават ранкам хвойка блёскатам іграе,
Мары-падарункі пад сабой хавае.
Толькі будзе радасць і ніякіх слёз.
Не спыняе справу Зюзя-Дзед Мароз!

Як такім дзянёчкам усядзець ў хаце,
Калі снег іскрыцца і заве гуляці.
Толькі вось шкада так, што кусае нос...
Не спыняе справу Зюзя-Дзед Мароз!

Анатолій Козіч

# Мароз не размалюе шклопакеты

Мароз не размалюе шклопакеты,
Не пакарпіць сівы мастак над шклом.
Нібыта дробязь, недарэчы гэта.
А неяк неўтульна з тым акном.

Няма чароўнай маляванай казкі,
Не ўгледзішся ў папараць дзівос.
Ды толькі памяць, са сваёе ласкі,
Душу праймае да пяшчотных слёз.

Як некалі не здолеў, не згадайся
Які разок узоры тыя зняць.
Каб хоць на картцы ды палюбаваўся,
Як хараством карункі тыя сняць!

Ды не, на картцы то было б не тое.
Няма там сонца, што пральле жыццё.
І толькі ўспамінам пра былое
Тужлівай асалоды пачуццё.

Мароз і не кранае шклопакеты.
Пазрыстасці не засціць аніяк.
І не стужышся з надыходам лета.
Не замярзаюць вокны, гэта так...

Мароз не размалюе шклопакеты...

Анатолій Козіч

# Пакуль дзеці спалі ночку

Пакуль дзеці спалі ночку,
Да хацінкі нехта збочыў.
Дакрануўся да акенца –
Змаляваў узорам шкельца.

Завітаў да нас у хату,
Што не чулі мама, тата.
І, нібыта знаў сцяжынкі,
Рушыў прама да ялінкі.

Мех шырокі развязаў,
Нешта доўга там шукаў,
І вышэйшага гатунку
Ён дастаў нам падарункі!

Сам падаўся к іншым дзецям,
Нас жа шмат жыве на свеце!
Барада, чырвоны нос.
Усіх любіць Дзед Мароз!

Анатолій Козіч

# Напярэдадні Калядаў

Напярэдадні Калядаў прыцярушана сняжком
Поле з лугам-даляглядам, з хмызнякамі і стажком,
З краявідам дальняй вёскі і азёрнай чысціні,
Лесу гонкія бярозкі, на ўскрайку тры сасны.

Напярэдадні Калядаў усталюецца мароз.
Неба чысцінёй святочнай сыпле зоркі цераз воз.
Недасяжная дрыготкасць зрок трымае і пагляд.
І такая сэрцу лёгкасць, нават ветрык, нібы брат.

Напярэдадні Калядаў у чараўніцтве тоне ўсё.
Нехта зычыць праз гаданне прадказаць сваё жыццё.
Ну а нехта, проста марай, адчувае хараство
І натхнёна так чакае ён Святое Ражджаство!

Анатолій Козіч

# Занясі сняжком

Напэўна, узрастуць на дарогах сумёты.
Злятаюцца птушкі бліжэй да жытла.
Зіма прынясе за сабою турботы.
А сэрцам і хочацца, каб замяла.

Каб выла завея ад ночы да ранку,
Каб белым навокал, нібыта ў сне.
Зіму адчуваць ужо новым світанкам,
Узрадвацца шчыра ўсё той жа зіме.

Навокал – каб бы чарадзейнаю казкай,
Каб кожны кусток зіхацеў бы палац.
Зіма, заняці наваколле, будзь ласкай!
Зайзята ўслых данясу гэты сказ.

А толькі пакуль што ня бачна завеі,
І хлусіць, відаць, усё адно, каляндар.
Зіма, на цябе не губляю надзеі.
Сняжком занясі, не зварочвай свой твар.

Анатолій Козіч